УДК 069.12-053.5

# ДА ПЫТАННЯ ПРАЦЫ МУЗЕЯЎ У САВЕЦКІ ЧАС З ДЗІЦЯЧАЙ АЎДЫТОРЫЯЙ

***Г. А. Машнюк,***
*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца развіццё форм работы музеяў СССР з дзіцячай аўдыторыяй. Характарызуюцца асаблівасці прымянення разнастайных кірункаў работы з дзецьмі ў розныя гістарычныя перыяды існавання савецкіх музеяў. На прыкладзе асобных савецкіх рэспублік паказваюцца прыклады працы з дзецьмі ў музеях featureрознага профілю. Выяўлены этапы ў змяненні характару прымянення разнастайных форм працы з дзецьмі і моладдзю ў музеях Савецкага Саюза.
**Ключавыя словы:** музей, музеязнаўства, формы работы, дзіцячая аўдыторыя.

# TOWARD THE QUESTION OF MUSEUMS' WORK WITH CHILDREN'S AUDIENCES IN THE SOVIET PERIOD

***G. Mashnyuk,***
*Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Sciences of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the development of forms of work of USSR museums with children's audiences. The author characterizes the features of the application of various areas of work with children in different historical periods of the existence of Soviet museums and shows examples of work with children in museums of various profiles using the example of individual Soviet republics. The article reveals the stages of change in the nature of the use of various forms of work with children and youth in museums of the Soviet Union.
**Keywords:** museum, museology, forms of work, children's audience.

З прыходам савецкай улады музей стаў адным з ключавых кірункаў культурнай палітыкі бальшавікоў. У перыяд рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны ішоў працэс станаўлення музея як інстытута новай улады. Пасля Грамадзянскай вайны музей набыў ролю асветніцкай установы. У час новай эканамічнай палітыкі вялікая роля ў працы музеяў надавалася адлюстраванню рэвалюцыйных падзей і пачатку сацыялістычнага будаўніцтва. З прыпыненнем палітыкі НЭПа змянілася і роля музея, ужо не як асветніцкай установы, а аднаго з састаўных элементаў камуністычнай прапаганды. У 1938 г. В. Радус-Зяньковіч (начальнік музейна-краязнаўчага ўпраўлення Народнага камісарыята асветы СССР) пацвердзіў, што мэта музея – быць прапагандыстамі, папулярызатарамі ў шэрагах пралетарыяту ідэй савецкага патрыятызму [10, с. 164–165].

Акрамя прапаганды і папулярызацыі камуністычных ідэй музей таксама ажыццяўляў сацыялізацыю і выхаванне дзяцей. Не апошнюю ролю ў дадзеным працэсе адыгралі вядомыя яшчэ да рэвалюцыі педагогі і музеязнаўцы М. У. Зелянко, М. Дз. Бартрам, Я. П. Мексін, якія бачылі вялікую значнасць музея для дзяцей. Асноўнай ідэяй працы з дзіцячай аўдыторыяй было тое, што музей павінен выпрацоўваць «пачуццёвую адукаванасць», імкненне да творчасці з выкарыстаннем эксперыментаў, якія падводзяць да новых ведаў [9, с. 22].

Аднак са зменай ідэалагічнай сітуацыі ў СССР на рубяжы 1920–1930-х гг. змянілася і палітыка ў адносінах да музеяў. Ранейшыя энтузіясты адышлі ад актыўнай працы з дзіцячай аўдыторыяй: М. Дз. Бартрам, Я. П. Мексін. Асабліва быў захоплены ідэяй стварэння вялікага дзіцячага музея М. У. Зелянко (1871–1953). Не апошняй у ідэі стварэння вялікага савецкага дзіцячага музея была паездка ў Бруклінскі дзіцячы музей, што знаходзіўся ў ЗША. Я. П. Мексін (1886–1943), дырэктар «Музея цацкі» ў Маскве, у пачатку 1930-х гг. трапіў пад першыя хвалі рэпрэсій [14, с. 11]. Падобны паварот тлумачыцца пераходам да будаўніцтва сацыялізму па сталінскім узоры з усталяваннем адзінай дзяржаўнай ідэалогіі ў палітычным ладзе СССР, умацаваннем улады І. В. Сталіна. Акрамя непасрэдных рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да асоб, якія сталі піянерамі працы з дзіцячай аўдыторыяй у музеях, адбылася агульная бюракратызацыяй музейнай сістэмы. Гэта прывяло да адыходу ад актыўнай камунікацыі (фактычнага ажыццяўлення тэорыі музейнай камунікацыі) да мадэлі інфармацыйна-прапагандыскага характару працы музея з усімі катэгорыямі наведвальнікаў.

У Савецкай Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі савецкай улады назіраўся вялікі рост колькасці музеяў, асабліва краязнаўчых. Дадзеныя абставіны былі звязаныя з палітыкай беларусізацыі, і таму музей быў фарпостам фарміравання нацыянальнай беларускай ідэнтычнасці, у тым ліку і ў дзяцей. Праца краязнаўчых музеяў, у прыватнасці, адукацыйнага кірунку была самастойнай ініцыятывай, не рэгулявалася дзяржаўнымі кіруючымі органамі ці ўстановамі адукацыі [7, с. 382]. З распачатымі рэпрэсіўнымі мерапрыемствамі ў сферы барацьбы з так званым нацыянал-дэмакратызмам музеі краязнаўчага профілю маглі лёгка атрымаць абвінавачванне ў нацыяналізме. Таму краязнаўчы рух у першай палове 1930-х гг. спыніў сваю працу па палітычных прычынах [5, с. 105–107; 2, с. 9].

У пасляваенны перыяд музеі, у прыватнасці ў БССР, аднаўлялі сваю працу. Многія музейныя зборы за часы нацысцкай акупацыі былі разрабаваны і вывезены за мяжу. У ідэалагічным аспекце экспазіцыі краязнаўчых музеяў сталі канцэптуальна насіць савецкі ці агульнарускі наратыў гісторыі, аднак экспанаты адлюстроўвалі беларускую гісторыю [6, с. 115–118].

Як адзначае М. А. Бяспалая, у пасляваенны час у агульнай працы з дзецьмі і моладдзю не патрэбна было рабіць кардынальных змяненняў у палітыцы патрыятычнага выхавання. Яшчэ ў 1950-я гг. было шмат удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Таму ў калектыўным уяўленні не патрабавалася тлумачэння, што такое патрыятызм. Толькі з цягам часу, калі колькасць ветэранаў пачне значна скарачацца, узнікне патрэба ў актывізацыі патрыятычнага выхавання дзяцей, у тым ліку з дапамогай сродкаў музея [3, с. 5].

Пасля смерці І. В. Сталіна і з пачаткам «адлігі» ў працы музеяў пачалі адбывацца змены. Так, краязнаўчы рух, які спыніў сваю актыўную працу ў 1930-я гг., стаў адраджацца ў розных рэгіёнах СССР. Немалаважную ролю ў гэты час адыгралі часопісы «Маладая гвардыя» і «Наш сучаснік», на старонках якіх выходзілі артыкулы з заклікамі да захавання гісторыка-культурнай спадчыны. У прыватнасці, медыявіст і мастацтвазнаўца Дз. Ліхачоў высока ацаніў намаганні ціхвінскіх школьнікаў, якія збіралі прадметы даўніны для свайго краязнаўчага музея і аднавілі традыцыі мясцовага краязнаўства амаль праз 30 год заняпаду [7, с. 383–384].

Перыяд 1960–1970-х гг. характарызуецца выкарыстаннем у працы музеяў так званай інфармацыйнай мадэлі. Адной з асноўных функцый музея на той перыяд з'яўлялася функцыя пашырэння навуковых ведаў, у тым ліку сярод дзяцей і моладзі. У другой палове XX ст. адбываецца «музейны бум» – павелічэнне колькасці навед-

вальнікаў музеяў, агульнай цікавасці да мінулага і гісторыка-культурнай спадчыны. У сваю чаргу адбывалася павелічэнне колькасці музеяў, які б задавальнялі гэты попыт. Напрыклад, у БССР з'явілася больш за 30 музеяў толькі краязнаўчага профілю. На думку І. І. Бамбешка, у час «музейнага буму» з'явіліся правобразы сучасных музейных форм работы, якія выкарыстоўваюцца ў працы з дзіцячай аўдыторыяй сёння. Гэта сустрэчы з цікавымі людзьмі, музейныя святы, літаратурныя вечарыны, канцэрты. Музей заставаўся цэнтрам ідэалагічнага выхавання, таму існавалі такія формы работы як прыём у піянеры, уручэнне пашпартоў [1, с. 70; 2, с. 13].

У 1970–1980-я гг. у музейнай справе ствараецца агульная гістарычная канва, якая становіцца канцэптуальнай асновай для экспазіцый краязнаўчых музеяў. Таксама ў краязнаўчых музеях робіцца акцэнт на мясцовым каларыце і фарміраванні гістарычнай свядомасці. І дадзеныя працэсы ўжо не выклікалі асаблівай негатыўнай рэакцыі з боку кіруючых дзяржаўных органаў [7, с. 393].

У пачатку 1980-х гг. савецкія музеі працягвалі выконваць прапагандыска-ідэалагічную функцыю. Напрыклад, у Хакаскім краязнаўчым музеі за 1980 г. прайшло агулам 30 мерапрыемстваў, тры з якіх былі разлічаныя на дзіцячую аўдыторыю. У асноўным гэта былі мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня Перамогі, Дня нараджэння У. І. Леніна, праводзіліся сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, ветэранамі працы і інш. Асноўны акцэнт у працы з дзіцячай аўдыторыяй рабіўся на экскурсійным абслугоўванні, аднак існавала праблема таго, што музей і школа не ў поўным аб'ёме ўзаемадзейнічалі, матэрыялы экспазіцый музея не выкарыстоўваліся падчас выкладання школьных прадметаў [4, с. 161–162].

Як адзначае В. В. Мізгіна на прыкладзе Харкаўскага мастацкага музея, настаўнікамі музейная экспазіцыя ўспрымалася як дадатак да школьнай праграмы, а ад музейнага супрацоўніка патрабавалася гістарычная і сацыяльна накіраваная інфармацыя. У сваю чаргу супрацоўнікі Харкаўскага музея бачылі мэтай працы з дзецьмі навучыць іх «мове» мастацтва. Такую працу, на думку В. В.Мізгіной, трэба было ажыццяўляць з аўдыторыяй ранняга ўзросту. І з 1986 г. у Харкаўскім мастацкім музеі пачынае працаваць «Сямейны лекторый» для дзяцей ад 6–7 год. З улікам псіхалагічнага развіцця дзяцей і іх здольнасцей успрымаць інфармацыю ў цікавай і дынамічнай форме (занятак 10–15 хвілін) юныя наведвальнікі знаёміліся з музыкай. Выкладчык музычнай школы распавядаў асноўную тэму, потым вучні музычнай школы выконвалі непрацяглую па часе музычную п'есу. Знаёмства з жывапісам адбывалася з дапа-

могай двух музейных прадметаў — карцін, якія дзеці разглядалі, самі апісвалі сюжэты, колеры, а калі ў іх узнікалі цяжкасці, то на дапамогу звычайна прыходзілі бацькі. У канцы такіх заняткаў дзеці атрымлівалі «дамашняе заданне», напрыклад, намаляваць сваю сям'ю [11, с. 62–63].

У сярэдзіне 1980-х гг., з пачаткам палітыкі перабудовы, адбываліся змены і ў працы з дзіцячай аўдыторыяй. Актыўна пашыраліся дзіцячыя клубы, якія пачалі ўзнікаць пры школах, музеях, як турыстычнага, краязнаўчага, так і археалагічнага характару. У археалагічных клубах дзеці ў якасці добраахвотнікаў дапамагалі падчас раскопак [13, с. 249]. Прыкладам можа служыць клуб «Бацькаўшчына» г. Пушча-Водзіца (зараз частка г. Кіева), які ўзнік у сярэдзіне 1980-х гг. Школьнікі – удзельнікі клуба – сталі арганізатарамі «Музея баявой славы 304-й Сумска-Кіеўскай стралковай дывізіі» (пачаў працу ў 1987 г.), якая вызваліла Пушчу-Водзіцу. Дадзены клуб супрацоўнічаў з іншымі музеямі, напрыклад, музеем «Героі Дняпра» (г. Івана-Франкоўск) [12, с. 35–37].

Беларускія музеі ў познесавецкі перыяд таксама былі ўключаны ў змену мадэлі ўзаемадзеяння з наведвальнікамі, у тым ліку і дзіцячай аўдыторыяй. Адбываўся адыход ад інфарматыўнай мадэлі да камунікатыўнай. Гэта адлюстравалася ў кардынальным пераглядзе падыходаў у працы беларускіх музеяў з дзіцячай аўдыторыяй. У сваёй рабоце для адлюстравання новага фармату працы музеі пачалі карыстацца тэрмінам «культурна-адукацыйная дзейнасць». Пачаўся рабіцца акцэнт на пачуццёвай сферы ўспрымання музейнага прадмета, а шырэй – і гісторыка-культурнай спадчыны. У беларускіх музеях у час перабудовы пашыраецца колькасць дзіцячай музейнай аўдыторыі за кошт дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту [2, с. 14].

Такім чынам, працу з дзіцячай аўдыторыяй у савецкі перыяд можна падзяляць на некалькі этапаў. Першы – 1920-я гг. – характарызуецца актыўным выкарыстаннем перадавых музейных тэхналогій у сферы музейнай работы з дзіцячай аўдыторыяй, распрацоўкай новых форм і відаў працы. Другі – 1930–1950-я гг. – мае рысы адыходу ад актыўнай працы з дзіцячай аўдыторыяй, фармалізацыі форм працы. Трэці – 1960–1980-я гг. – прыкметны аднаўленнем актыўнай працы з дзіцячай аўдыторыяй, адраджэннем краязнаўчага руху з актыўным удзелам у ім дзяцей, распрацоўкай і выкарыстаннем новых музейных форм работы пад пэўныя ўзроставыя групы (клубаў, лекторыяў, музейных урокаў), супрацоўніцтвам з іншымі моладзевымі аб'яднаннямі на базе школ ці

школьных музеяў. Можна зрабіць выснову, што праца музеяў з дзіцячай і падлеткавай аўдыторыяй, асабліва напрыканцы існавання СССР, заклала тэарэтычны і практычны патэнцыял, які будзе актыўна развівацца і ў постсавецкі перыяд.

1. *Бамбешка, І. І.* Генезіс культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі / І. І. Бамбешка // Искусство и культура. – 2020. – № 2 (38). – С. 67–71.

2. *Бамбешка, І. І.* Культурна-адукацыйная дзейнасць краязнаўчых музеяў Беларусі па актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / І. І. Бамбешка ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2021.– 26 с.

3. *Бяспалая, М. А.* Сістэма, змест, перспектывы патрыятычнага выхавання ў музеях / М. А. Бяспалая // Музеі і патрыятычнае выхаванне : матэрыялы рэсп. навук-практ. канф. (Мінск, 28 лістап. 2012 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 4–7.

4. *Григорьева, Н. С.* Работа с детьми в Хакасском областном краеведческом музее в начале 1980-х гг. / Н. С. Григорьева // Тенденции развития науки и образования. – 2020. – № 63. – Ч. 5. – С. 161–163.

5. *Гужаловский, А. А.* Музеи БССР в годы культурной революции. 1928–1941 гг. / А. А. Гужаловский // Sunkusis Paveldas. Acta Museologica lithuanica. – 2015.– Т. 2.– С. 87–122.

6. *Данилович, А. В.* Белорусские музеи в 1920–1960-е гг. / А. В. Данилович, И. А. Корнеенкова // Сб. науч. тр. сотрудников кафедры «История, мировая и отечественная культура» БНТУ / под ред. В. А. Божанова, Д. Н. Хромченко. – Минск, 2014. – С. 110–122.

7. *Донован, В.* «Идя назад, шагаем вперед»: краеведческие музеи и создание местной памяти в Северо-Западном регионе. 1956–1981 / В. Донован // Антрополог. форум. – 2012. – № 16. – С. 379–402.

8. *Егорова, О. В.* Трансформация социальных институтов культуры на селе с советского периода до современности / О. В. Егорова, И. В. Дмитриева // Вестн. Чуваш. ун-та. – 2019. – № 4.– С. 73–83.

9. *Карабутина, Т. В.* Просветительская работа с детьми в период становления советского государства (20–30-е гг. XX в.) / Т. В. Карабутина, О. Б. Лобанова // Перспективы науки – 2015 : сб. докл. I Междунар. заоч. конкурса науч.-исслед. работ, Казань, 12–26 окт. 2015 г. / науч. ред. А. В. Гумеров. – Т. 1. – Казань, 2015. – С. 17–24.

10. *Мазур, Л. Н.* Провинциальный музей в фокусе культурной политики советского государства: между просвещением, пропагандой и памятью / Л. Н. Мазур // Документ. Архив. История. Современность : сб. науч. тр. / гл. ред. Л. Н. Мазур. – Екатеринбург, 2023. – Вып. 23. – С. 157–177.

11. *Мизгіна, В. В.* Музей і юний глядач. Ретроспектива й сучасність / В. В. Мизгіна, І. М. Сідельова // Луньовські читання : матеріали науково-практичних семінарів (2010–2014 рр.). – Харків, 2014. – С. 60–68.

*12. Петько, Л. В.* Підлітки і туризм / Л. В. Петько // Радяньска школа. – 1989. – № 2. – С. 35–40.

*13. Поправко, Е. А.* Культурно-образовательная и рекреационная работа музеев Приморского края с детской и молодежной аудиторией: поиск новой модели (1985–2010-е гг.) / Е. А. Поправко // Инновацион. соц.-эконом. технологии в реализации гос. молодеж. политики: возможности и перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., СПб., 20–22 нояб. 2014 г. / под ред. Г. В. Ковалевой. – СПб., 2014. – С. 247–250.

*14. Рашитова, Р. С.* Деятельность музеев РСФСР по воспитанию детей 1917–1987 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Р. С. Рашитова ; Гос. ком. СССР по нар. образованию, Ун-т дружбы народов им. П. Лумумбы. – М., 1989. – 15 с.